ЯКІМ БУДЗЕ БДУ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ?
Гутарка з начальнікам упраўлення па рабоце з персаналам Наталляй НЯПЕЎНАЙ
Стар. 2

ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ МІЖНАРОДНЫХ РЭЙТЫНГАЎ УНІВЕРСІТЭТАЎ
Аглядаем сітуацыю ў «вышэйшай лізе»
Стар. 3

МАГЧЫМАСЦІ! КАЛІ КАЗАЦЬ ПРА БДУ АДНЫМ СЛОВАМ
Названы пераможцы конкурсу «Студэнты года БДУ»
Стар. 4–5

«ВЫПУСКАЦЬ КОЖНЫ ГОД ПА КАНДЫДАТУ»
Сяргей КАСЦЮК у праекце «Новы погляд»
Стар. 6

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

Годам адукацыі Беларусі ў Кітаі абвешчаны 2019 год

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел рэктар БДУ Андрэй Кароль, кіраўніцтва беларускіх ВНУ ў складзе дэлегацыі на чале з міністрам адукацыі нашай краіны Ігарам Карпенкам. Візіт у КНР праходзіў з 8 па 13 студзеня.

Падпісанне пратакола з рэктарам Чжэцзянскага Шужэн універсітэта Сюй Сюйчынам

Супрацоўніцтва ў галіне адукацыі з'яўляецца прыярытэтным кірункам у развіцці ўзаемавыгадных адносін дзвюх краін.

У БДУ плануецца рэалізацыя шэрагу мерапрыемстваў, прымеркаваных да тэматычнага года. У тым ліку – правядзенне кітайска-беларускага моладзевага форуму, Дня інстытутаў Канфуцыя, летніх школ для грамадзян КНР, арганізацыя даследаванняў развіцця беларуска-кітайскіх адносін і інш.

Першымі ініцыятывамі ў рамках года адукацыі Беларусі ў Кітаі стала падпісанне двух дакументаў паміж БДУ і Далянскім політэхнічным універсітэтам (Dalian University of Technology, ДПУ). Адзін з іх мяркуе стварэнне на базе БДУ **сумеснай адукацыйнай структуры**, дзе будзе арганізавана навучанне студэнтаў па праграмах I і II ступеняў вышэйшай адукацыі. Адпаведны дакумент з кітайскага боку падпісаў старшыня парткама ДПУ Ван Ханьсун.

Паводле другога дакумента плануецца стварэнне **сумеснага навукова-інавацыйнага цэнтра**. Ён будзе дзейнічаць на базе існуючага Сумеснага інстытута ДПУ–БДУ і стане пляцоўкай для вытворчай практыкі студэнтаў і правядзення сумесных даследаванняў. Подпісы пад дакументам паставілі кіраўнікі дзвюх ВНУ Андрэй Кароль і Го Дунмін.

З рэктарам Чжэцзянскага Шужэн універсітэта Сюй Сюйчынам дасягнута дамоўленасць пра правядзенне ў БДУ першага **кітайска-беларускага моладзевага форуму**.

Форум стане ўнікальнай пляцоўкай па абмене інавацыйнымі ідэямі і тэхналогіямі ў розных навуковых галінах. Праблемнае поле ахопіць пытанні абароны навакольнага асяроддзя, галіну інфарматыкі, апрацоўкі вялікіх масіваў дадзеных, стварэнне камп'ютарных праграм і сетак на тэхналогіях «штучнага інтэлекту» і інш. Мяркуецца, што маштабная падзея пройдзе ў БДУ ў маі бягучага года, а пасля плануецца арганізоўваць мерапрыемства раз у два гады.

Праграма візіту беларускай дэлегацыі ў Кітай уключала таксама ўдзел яе прадстаўнікоў у канферэнцыі «Пытанні і перспектывы развіцця беларуска-кітайскіх адносін у сферы адукацыі». Рэктар Андрэй Кароль выступіў з дакладам пра супрацоўніцтва БДУ з універсітэтамі і навуковымі арганізацыямі Кітая. Акрамя таго, адбыліся сустрэчы з кіраўніцтвам кітайскіх ВНУ па пытаннях перспектыўных кірункаў узаемадзеяння, рэалізацыі сумесных адукацыйных праграм і даследаванняў. Беларуская дэлегацыя наведала таксама цэнтр вывучэння Беларусі пры ДПУ, дзе былі разгледжаны перспектывы развіцця партнёрскіх адносін і прайшла сустрэча са студэнтамі з Беларусі, якія навучаюцца ў ДПУ і іншых універсітэтах правінцыі Ляанін.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў 25 студзеня дыпломы доктара навук і атэстаты прафесара навуковым і педагагічным работнікам. Сярод іх і супрацоўнікі БДУ. Атэстат прафесара па спецыяльнасці «педагогіка» ўручаны рэктару БДУ **Андрэю Каралю**, атэстат прафесара па спецыяльнасці «літаратуразнаўства» – прафесару кафедры міжнароднай журналістыкі факультэта журналістыкі **Таццяне Дасаевай**. Дыпломы доктара навук атрымалі: загадчык кафедры мытнай справы ФМА **Віктар Астрога** і дацэнт кафедры псіхалогіі ФФСН **Аляксей Палякоў**.

Усяго дыпломаў доктара навук ганараваны 12 беларускіх навукоўцаў розных навуковых сфер, а атэстаты прафесара атрымалі сем дзеячаў навукі.

Традыцыйна цырымонія ўручэння праходзіла напярэдадні Дня беларускай навукі, які штогод адзначаецца ў апошнюю нядзелю студзеня.

ДЭЛЕГАЦЫЯ Міністэрства адукацыі Беларусі наведала Навукова-тэхналагічны парк «Унітэхпрам» БДУ. Першы намеснік міністра **Ірына Старавойтава** і начальнік упраўлення навукі Міністэрства адукацыі **Алег Бараноўскі** сустрэліся з прарэктарам па навуковай рабоце БДУ **Васілём Сафонавым** і дырэктарам «Унітэхпрама» **Паўлам Бычкоўскім**.

Праграма візіту дэлегацыі беларускага ведамства ўключала наведванне вытворчых участкаў, аснашчаных сучасным фармацэўтычным абсталяваннем. У іх ліку малатыражная вытворчасць арыгінальных і генерычных фармацэўтычных субстанцый і лекавых сродкаў, распрацаваных у лабараторыі хіміі поліцукрыдаў НДІ ФХП БДУ, і інш.

ПРАРЭКТАРАМ па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ прызначаны кандыдат фізіка-матэматычных навук **Канстанцін Казадаеў**.

Казадаеў Канстанцін Уладзіміравіч нарадзіўся ў 1983 г. у Тамбоўскай вобласці (РФ). Скончыў з залатым медалём СШ № 1 Новалукомля, з адзнакай фізічны факультэт БДУ. У 2006 годзе абараніў магістарскую дысертацыю і паступіў у аспірантуру факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ. Выпускнік эканамічнага факультэта 2007 г. У 2009 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Фарміраванне наначасціц металаў метадам лазернай эрозіі і аўтаматызаваная ацэнка іх параметраў». У 2011 годзе скончыў ІБМТ БДУ па спецыяльнасці «Кіраванне персаналам». У 2012 г. прысвоена навуковае званне «дацэнт» па спецыяльнасці «Фізіка».

Працоўная дзейнасць у БДУ пачалася ў 2006 г. у НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі. З 2009 г. – старшы выкладчык, з 2010 г. – дацэнт, з 2015 года – намеснік загадчыка і з 2016 па 2019 год – загадчык кафедры інтэлектуальных сістэм ФРКТ.

З 2015 года – дактарант БДУ.

З 2018 г. – сакратар бюро Дзяржаўнага экспертнага савета № 6 «Інфарматыка, інфарматызацыя і касмічныя даследаванні» ДКНТ РБ. Суаўтар комплекснага прагнозу навукова-тэхнічнага прагрэсу Беларусі на сярэднетэрміновую і доўгатэрміновую перспектыву па напрамку «Сувязь і інфарматызацыя» (ДКНТ, БелІСА). З 2018 года – член камісіі па прэміраванні кіраўнікоў комплексу БДУ.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

Кадравая стратэгія: якім будзе БДУ праз некалькі гадоў?

Сфарміраваць унікальны калектыў БДУ, дзе кожны зможа раскрыць і рэалізаваць свае здольнасці і ініцыятывы, – у гэтым заключаецца асноўная канцэпцыя стратэгічнай кадравай мэты на 2019–2021 гады, якая была прадстаўлена на Савеце ВНУ. Пра тое, што плануецца змяніць ва ўмовах працы, даведаліся ў начальніка ўпраўлення па рабоце з персаналам **Наталлі НЯПЕЎНАЙ.**

Акцэнт змесціцца на працэс кіравання персаналам

Як адзначыў на Савеце ВНУ першы прарэктар Аляксей Івашкевіч, распрацаваная стратэгія заклікана задаволіць жаданні ўсіх зацікаўленых бакоў. Супрацоўнікам хочацца простай і эфектыўнай сістэмы матэрыяльных стымулаў, мець магчымасць прафесійна развівацца і расці па кар'еры. У сваю чаргу кіраўнікі чакаюць убачыць павелічэнне долі высокакваліфікаваных навуковых і педагагічных кадраў, рэалізацыю патэнцыялу работнікаў для прыцягнення пазабюджэтных сродкаў, змяшчэнне акцэнтаў дзейнасці на міждысцыплінарнасць. Адзначана, што кадравая стратэгія сугучная тым мэтам, якія ўказаны ў стратэгіі развіцця ўніверсітэта.

– Асаблівасць кадравай стратэгіі заключаецца ў тым, што мы змяшчаем акцэнт з кадравага ўліку на працэсы кіравання персаналам, – тлумачыць Наталля Няпеўная. – У гэтай частцы вылучаны 4 асноўныя кірункі, у якіх закладзены механізмы рэалізацыі мэт. Гэта планаванне персаналу і адаптацыя, навучанне і развіццё, матывацыя і ацэнка, інфарматызацыя сістэмы кіравання персаналам – у рамках гэтых кірункаў будуць выбудоўвацца ўсе працэсы працы з супрацоўнікамі.

Што такое ўнікальны калектыў?

– Безумоўна, самая значная мэта – гэта фарміраванне ўнікальнага калектыву, які скіруе ўніверсітэт на інавацыйны шлях развіцця, – кажа Наталля Томашаўна. – Лічу, што такі калектыў у нас ужо ёсць. Гэта адзін з самых высокаадукаваных і інтэлектуальных калектываў у краіне. У БДУ даволі вялікая доля супрацоўнікаў са ступенню: на сёння 52,4 % выкладчыкаў маюць навуковую ступень і званне.

Па словах начальніка ўпраўлення па працы з персаналам, яшчэ ўнікальнасць бачыцца ў тым, што ў нас сабраны адны з найбольш высокапрафесійных спецыялістаў у розных галінах ведаў. Акрамя гэтага нашы супрацоўнікі паралельна са сваімі першаснымі абавязкамі выконваюць шэраг дадатковых задач: займаюцца навукай, выхаваўчым працэсам, удзельнічаюць у грамадскай дзейнасці.

Кірунак № 1. Планаванне персаналу і адаптацыя

Для рэалізацыі гэтага кірунку ўжо зроблены шэраг крокаў: пераразмеркаваны абавязкі паміж рэктарам і прарэктарскім корпусам, размяшчаюцца вакансіі на ўнутраных і знешніх інфармацыйных рэсурсах, існуе адкрыты конкурс ПВС, ёсць сістэма падаўжэння кантрактаў ПВС на падставе крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці працы, стартавала «школа адаптацыі» ў рамках Карпаратыўнага ўніверсітэта.

Адной з мэт з'яўляецца ўкараненне сістэмы кадравага планавання, якая дазволіць аптымальна размеркаваць персанал з улікам арганізацыі адукацыйнага працэсу і спецыфікі працы структуры.

– Планаванне прадугледжваецца менавіта ва ўдзеле кіраўнічых асобаў у распрацоўцы планаў ратацыі кадраў, у падаўжэнні ці спыненні працоўных адносін, прызначэнні на вышэйшыя пасады. Пакуль гэта адбываецца не планава, а кропкава. Аднак, калі кіраўнік будзе бачыць найбліжэйшую перспектыву працы свайго калектыву, гэта спросціць задачу ўсім, – кажа Наталля Томашаўна.

Калі гаварыць пра адкрыты конкурс для ПВС, то ў БДУ ён ужо ёсць. Заканадаўства прадугледжвае размяшчэнне аб'яў на конкурс для выкладчыкаў на інфармацыйных рэсурсах. Калі раней гэта адбывалася на старонках газеты «Універсітэт», то цяпер аб'явы публікуюцца ў інтэрнэце і не толькі для ПВС – конкурс можа быць абвешчаны на любую вакансію (сайт БДУ, tut.by, сацыяльныя сеткі). Зараз любы грамадзянін, які адпавядае кваліфікацыйным патрабаванням, можа прэтэндаваць на пасаду ва ўніверсітэце. Гэта інфармацыя стала больш даступнай і празрыстай, чым раней.

Таксама стаіць мэта распрацаваць прылады для эфектыўнай адаптацыі персаналу. У БДУ ўжо працуе Карпаратыўны ўніверсітэт, накіраны на ўнутранае навучанне работнікаў. На яго базе функцыянуе некалькі школ, адна з іх – «школа адаптацыі». Дзякуючы ёй у маладых супрацоўнікаў ёсць магчымасць у кароткія тэрміны азнаёміцца з гісторыяй універсітэта, яго структурай і службамі.

– На прыкладзе працы школы мы сутыкнуліся з тым, што адаптацыя патрэбна не толькі маладым спецыялістам, а практычна любому супрацоўніку, які расце па кар'еры, рухаецца вертыкальна або гарызантальна. Асабліва кіраўнікам. Магчыма, новаму прызначэнцу трэба нават больш часу адаптоўвацца на працоўным месцы, чым маладому спецыялісту. У сувязі з гэтым зараз нам неабходна распрацаваць праграму адаптацыі для розных катэгорый работнікаў, – каментуе Наталля Няпеўная.

Кірунак № 2. Навучанне і развіццё

Ужо былі выкананы наступныя крокі: укаранілі сістэму заахвочвання за абарону дысертацый ў тэрмін, распрацавана сістэма грантаў рэктара, усталявана квота для першачарговага засялення ў інтэрнат, актыўна працуе Савет маладых навукоўцаў, створаны міжуніверсітэцкі партал крэатыўнай адукацыі, Карпаратыўны ўніверсітэт, Цэнтр навуковых кампетэнцый і камунікацый.

Тут пастаўлена мэта павялічыць колькасць высокакваліфікаваных спецыялістаў. Як гэта зрабіць? І на гэта можна паўплываць, тлумачыць начальнік упраўлення па працы з персаналам:

– Па-першае, трэба ўмацаваць прэстыж прафесіі педагога. Па-другое, пашырыць сацыяльны пакет, каб супрацоўнікі разумелі, дзеля чаго яны павінны працаваць ва ўніверсітэце. Па-трэцяе, вядома, падняць заработную плату. Мы ставім задачу павялічыць на 3 % долю работнікаў з навуковымі званнямі і ступенямі, таму зноў жа трэба планаваць абароны дысертацый.

Асаблівасць кадравай стратэгіі заключаецца ў тым, што мы змяшчаем акцэнт з кадравага ўліку на працэсы кіравання персаналам

Кірунак № 3. Матывацыя і ацэнка

Укаранілі рэйтынгавую сістэму і сістэму прэміравання кіраўнікоў, распрацаваны механізм размеркавання пазабюджэтных сродкаў, ёсць фірмовы стыль, адчынена крама фірмовай сімволікі. Зараз пастаўлены мэты на ўстойлівы рост зарплаты, пашырэнне сацпакета, умацаванне карпаратыўнай культуры і ўнутраных камунікацый.

– Кірункі паміж сабой перасякаюцца, – робіць акцэнт Наталля Няпеўная. – Можна колькі заўгодна планаваць, але калі ў чалавека не будзе матывацыі і жадання працаваць, то ўсё гэта бессэнсоўна. Неабходна стварыць умовы для развіцця кар'еры, для таго, каб супрацоўнік захацеў пайсці вучыцца ў аспірантуру ці дактарантуру, напрыклад.

Адной з прылад матывацыі выступае сацыяльны пакет. Як лічыць начальнік упраўлення па працы з персаналам, у БДУ досыць добры сацыяльны пакет:

– Апроч тых гарантый, якія ўсталяваны дзяржавай, у нас ёсць шмат момантаў, прадугледжаных калектыўнай дамовай. Але сацыяльны пакет яшчэ можна пашырыць. Нам бы хацелася дадаць магчымасць добраахвотнага медыцынскага страхавання. Каб наш паважаны супрацоўнік не сядзеў у чарзе, а на падставе медыцынскай страхоўкі мог абраць, да якога спецыяліста пайсці і ў які медыцынскі цэнтр. Так, на гэта трэба немаленькае фінансаванне, але кіраўніцтва ўніверсітэта гатовае гэта пытанне разгледзець.

Універсітэт можа ганарыцца моцнай карпаратыўнай культурай, якой вось ужо амаль 100 гадоў. Як адзначае Наталля Няпеўная, шмат у чым на гэта ўплывае тое, што тут працуе інтэлігенцыя, якая толькі сваёй прысутнасцю стварае гэты карпаратыўны дух:

– Вядома, свой знёсак робяць сімволіка, карпаратыўны стыль і элементы адрознення – значок БДУ, крама карпаратыўнай сімволікі, сацыяльныя сеткі, Intranet, газета – усё гэта элементы карпаратыўнай культуры, якая ў нас развіта на высокім узроўні. Гэты дух універсітэта трэба падтрымліваць. Яшчэ ні разу не праводзілася комплекснае анкетаванне па лаяльнасці супрацоўнікаў. Вядома, мы мяркуем, што ўсе любяць БДУ, але хочацца гэта афіцыйна пацвердзіць. Адна з задач – правесці такое анкетаванне і паглядзець, як людзі ставяцца да ўніверсітэта.

Акрамя таго, у межах гэтай стратэгіі стаіць задача стварыць максімальна камфортныя ўмовы працы. Наталля Томашаўна прапанае гэта рабіць дзякуючы ўнутраным рэсурсам, прыцягваць студэнтаў-дызайнераў да арганізацыі навучальных прастор, офісных памяшканняў.

Кірунак № 4. Інфарматызацыя сістэмы кіравання персаналам

Працуе інфармацыйная сістэма «Кіраванне персаналам», функцыянуе асабісты кабінет супрацоўнікаў, створаны прафайлы выкладчыкаў і электронныя партфоліа, аўтаматызаваны адміністрацыйныя працэдуры па работніках. Тут пастаўлена мэта на максімальны пераход на «беспапяровы» офіс.

– Гэты пераход ужо ажыццяўляецца, – тлумачыць начальнік упраўлення па рабоце з персаналам. – На жаль, пакуль часцей за ўсё ў асабісты кабінет заходзяць паглядзець разліковы лісток. Насамрэч, ёсць шмат магчымасцяў выкарыстання рэсурсаў гэтай сістэмы. Тут можна размяшчаць важную інфармацыю для работнікаў, а пазней афармляць дакументы, звязаныя з працоўнымі адносінамі ў электронным выглядзе. Таксама нам бы хацелася, каб сістэма кіравання персаналам уключыла ў сябе інфармацыю не толькі пра кадры і студэнтаў, але і пра юрыдычныя асобы.

Стратэгія распрацавана на 3 гады

На яе аснове за студзень і люты будзе падрыхтаваны план укаранення прылад, якія дазволяць рэалізаваць усе мэты і задачы. На пытанне, як будзе выглядаць БДУ праз усе змены, Наталля Томашаўна адказвае:

– Думаю, наваўвядзенні пойдуць толькі на карысць. Мы кажам пра кадравую стратэгію, хоць маем на ўвазе персанал. Што такое персанал? Гэта персона, гэта канкрэтны чалавек. Наша задача ў тым, каб людзі, якія працуюць ва ўніверсітэце, маглі рэалізаваць свае ініцыятывы. Хочам, каб у кіраўніка быў не аўтарытарны стыль кіравання, а гарызантальнае лідарства, каб ён чуў кожнага работніка асобна. Каб мы маглі хутка рэагаваць на рынак і ўкараняць інавацыйныя тэхналогіі ў навучанне. Думаю, калі гэта будзе адбывацца, то эфектыўнасць і прадукцыйнасць, безумоўна, вырасту.

Алена ЛЯЎШЭНЯ



УНІВЕРСІТЭТ
5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

Тэндэнцыі развіцця міжнародных рэйтынгаў універсітэтаў

Дзесяць гадоў назад БДУ быў прадстаўлены ў адным рэйтынгу – вэбаметрычным рэйтынгу ўніверсітэтаў, у якім заўсёды было шмат беларускіх ВНУ. Гэты рэйтынг абнаўляўся кожныя паўгода, і яго ўсе чакалі – было цікава ўбачыць, хто каго абагнаў, як памянялася пазіцыя, як памянялася методыка, што трэба рабіць, каб абагнаць канкурэнтаў. Але паступова рэйтынгаў, у якіх удзельнічае ўніверсітэт, стала больш, і мала хто, акрамя экспертаў, можа без інтэрнэту сказаць штосьці пра кожны асобны рэйтынг, пра якія ў апошні час сталі так часта пісаць.

Інфармацыя з раздзела «БДУ ў сусветных рэйтынгах» на сайце БДУ

Першыя глабальныя рэйтынгі ўніверсітэтаў, шанхайскага, QS і THE, у 2003–2004 гадах аналізавалі каля 500 ВНУ, і патрапіць у гэты абмежаваны лік было вельмі складана. Рэйтынгі запрашалі большую колькасць ВНУ, каля 600–700, але паказвалі публіцы толькі першыя 500, што складае 1,5–2 % ад усіх вышэйшых навучальных устаноў свету. Такая малая частка абумоўлена ў першую чаргу тым, што ўсе дадзеныя збіраліся і правяраліся ўручную.

Вэбаметрычны рэйтынг, які з'явіўся ў 2006 годзе, зрабіў пераварот: ён ранжыраваў сайты дзяржаў з некалькіх тысяч ВНУ. Гэта яму ўдалося з-за выкарыстоўванай метадыкі: усе дадзеныя збіраюцца ў інтэрнэце з адкрытых ці камерцыйных баз дадзеных, якія змяшчаюць аналітыку па сайтах, спасылках на сайт і навуковых публікацыях. На сёння вэбаметрычны рэйтынг паказвае амаль 28 000 устаноў, сабраўшы максімальна вялікую выбарку. Сярод іншых масавых рэйтынгаў можна назваць SIR і URAP, якія аналізуюць навуковыя публікацыі прыблізна 5000 ВНУ, праўда, апошні заўсёды публікуе толькі 2500. Астатнія рэйтынгі, акрамя шанхайскага, таксама павялічваюць свой пул да 1000–1500, да 3–5 % ад усіх ВНУ. Такім чынам, павялічваецца лік гульцоў «вышэйшай лігі», замест 500 першых мы бачым ужо 1500 ВНУ.



Дынаміка БДУ

Па-першае, БДУ развіваецца, павялічваецца колькасць публікацый нашых работнікаў, праіндэксаваных базамі дадзеных Scopus і Web of Science. Навукоўцы БДУ прымаюць актыўны ўдзел у праекце Вялікага адроннага калайдара, публікуюць артыкулы з прарыўнымі адкрыццямі ў фізіцы элементарных часціц, якія з'яўляюцца цаглінкамі ў стварэнні новай фізікі.

Па-другое, брэнд БДУ распаўсюджваецца ва ўсім свеце: мы ўдзельнічаем у міжнародных выставах, заняўляемся і выйграём міжнародныя праекты, развіваем акадэмічную мабільнасць і экспарт адукацыйных паслуг. Усё больш людзей ведаюць пра БДУ, усё больш экспертаў ставяць нам станоўчую адзнаку ў апытаннях, якія праводзяцца рэйтынгавымі агенцтвамі.

Усё гэта дапамагае нам займаць высокія месцы ў рэйтынгах.

Сітуацыя ў «вышэйшай лізе»

У артыкуле «Ці запраўды ўніверсітэцкія рэйтынгі карысныя для паляпшэння даследаванняў?» часопіса Public Library of Science ONE (PLoS ONE), 2018, Том 13, № 3, кажуць пра 24 розныя рэйтынгі, але аналізуюць і параўноўваюць методыку толькі 13, адкідаючы рэйтынгі без навуковага складніку і якія перасталі публікавацца. Дарэчы, БДУ прадстаўлены ў 11 рэйтынгах. Калі вывучыць сітуацыю больш падрабязна, то ў кожным з 11 асноўных можна знайсці некалькі дадатковых. За апошнія гады амаль кожнае рэйтынгавае агенцтва стварыла некалькі драбнейшых рэйтынгаў і для падтрымання цікавасці размеркавала час іх публікацый раўнамерна на працягу года. Увосень практычна кожны тыдзень публікуецца адзін з рэйтынгаў, асноўны ці дадатковы. Дадатковыя рэйтынгі часта фарміруюцца на падставе тых жа самых дадзеных, але выкарыстоўваюць абмежаваную выбарку, напрыклад, па рэгіянальнай прыкмеце, або глядзяць дадзеныя толькі па адным з навуковых кірункаў – па фізіцы, па хіміі. Методыка іх можа супадаць з асноўнымі рэйтынгамі, а можа і зусім адрознівацца.

Яшчэ адна тэндэнцыя – павелічэнне колькасці ўдзельнікаў, бо ўсе хочуць паглядзець, якое месца яны займаюць. Базах дадзеных Scopus і Web of Science. Для ўключэння ў шматлікія рэйтынгі неабходна пераадолець бар'ер у 100–150 публікацый у год.

Разнастайнасць рэйтынгаў, іх метадаў і ўсталяваных мэт дазваляе ацаніць ВНУ і з навуковай пазіцыі (шанхайскі рэйтынг, THE, SIR, URAP), з пункту гледжання іміджу і вядомасці брэнда (QS) і з іншых бакоў. Некаторыя рэйтынгі наогул не робяць агульнага спісу. Так, U-Multirank складае велізарную базу дадзеных, у якой кожны можа падабраць універсітэт па самастойна зададзеных фільтрах і параметрах.

Для таго, каб не згубіцца ў моры лічбаў, метадык і незразумелых назваў, на сайце ўніверсітэта ёсць спецыяльны раздзел, прысвечаны рэйтынгам, дзе ўтрымліваецца актуальная інфармацыя пра пазіцыю БДУ, універсітэты Беларусі і суседніх краін. У навінах сайта мы імкнёмся размяшчаць толькі інфармацыю пра абнаўленне самых аўтарытэтных, самых вядомых рэйтынгаў, хоць некаторыя СМІ спрабуюць раздуць сенсацыю з кожнага абнаўлення малавядомых падрэйтынгаў, пра які ва ўсім свеце могуць напісаць усяго 5–10 навінавых парталаў і ўніверсітэтаў, якія туды ўпершыню патрапілі.

Уладзімір ГАЛЫНСКІ,
начальнік аддзела міжнародных рэйтынгаў, маркетынгу і акадэмічнай мабільнасці

Крытэрыі ацэнкі

З Беларусі ў рэйтынгах, акрамя вэбаметрычнага, можна заўважыць толькі БДУ, БНТУ, БДУІР, ГрДУ імя Я. Купалы. У ліку асноўных прычын такой сітуацыі можна назваць нізкую колькасць публікацый у іншых ВНУ, якія індэксуюцца ў навукаметрычных рэфератыўных

Дадзены артыкул адкрывае новую рубрыку газеты «Універсітэт», дзе будзе перыядычна публікавацца інфармацыя пра міжнародныя рэйтынгі ўніверсітэтаў, мы будзем адказваць на пытанні чытачоў, распавядаць пра методыкі і цікавыя факты.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

03 лютага Забрэйка Пётр Пятровіч, прафесар кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі
04 лютага Ціток Марына Аляксееўна, прафесар кафедры мікрабіялогіі
06 лютага Мятліцкі Ігар Яўгенавіч, дацэнт кафедры псіхалогіі
07 лютага Мядзянік Уладзімір Ільіч, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
07 лютага Папок Руслан Пятровіч, начальнік псіхалагічнай службы БДУ
07 лютага Садоўскі Антон Паўлавіч, прафесар кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу
08 лютага Беразоўскі Валерый Уладзіміравіч, дацэнт кафедры арганічнай хіміі
09 лютага Краўчук Аляксандр Сцяпанавіч, прафесар кафедры біо- і нанамеханікі
10 лютага Кальмакова Алена Генадзьеўна, загадчык кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій
12 лютага Сідорская Ірына Уладзіміраўна, загадчык кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю
13 лютага Тапаз Антаніна Анатольеўна, дацэнт кафедры геадэзіі і картаграфіі
16 лютага Сяргеева Вольга Валер'еўна, дацэнт кафедры неарганічнай хіміі
24 лютага Шабанаў Вячаслаў Барысавіч, загадчык кафедры крыміналістыкі
25 лютага Васкрасенская Алеся Аляксандраўна, загадчык кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў
27 лютага Круль Леанід Пятровіч, прафесар кафедры высокамалекулярных злучэнняў
28 лютага Зажогін Анатоль Паўлавіч, прафесар кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: мастацтваў і асяродзевага дызайну; філасофіі культуры; банкаўскай эканомікі; фізікі і аэракасмічных тэхналогій.

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднага турызму; фізікі і аэракасмічных тэхналогій; тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства; рускай літаратуры.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: нямецкай мовы; міжнародных эканамічных адносін; псіхалогіі; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў; міжнароднага турызму; гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў; крыніцазнаўства; філасофіі і метадалогіі навукі; сацыяльнай камунікацыі; мастацтваў і асяродзевага дызайну; сацыяльнай работы і рэабілітацыі; вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі; тэорыі функцыі; генетыкі; малекулярнай біялогіі; клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін; геаграфічнай экалогіі (геаэкалогіі); глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм; геадэзіі і картаграфіі; медыялінгвістыкі і рэдагавання; фізічнай электронікі і нанатэхналогій; інтэлектуальных сістэм; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; фізікі паўправаднікоў і наназлектронікі; агульнай фізікі; тэлебачання і радыёвяшчання; геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі; функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі; заалогіі.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: нямецкай мовы; інфармацыйных тэхналогій; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў; гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў; гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу; дызайну моды; псіхалогіі; сацыяльнай работы і рэабілітацыі; вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу; агульнай матэматыкі і інфарматыкі; эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі; рэгіянальнай геалогіі; міжнароднай журналістыкі; агульнай фізікі.

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій; міжнароднай журналістыкі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ агульнай экалогіі, біялогіі і экалагічнай генетыкі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220070, г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, корпус 1, аддзел кадравай і арганізацыйнай працы, каб. 202, тэл. 398 88 25.

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ БДУ»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці «сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі».

Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Пра стварэнне сумеснага Беларуска-кітайскага інстытута на базе БДУ – БелТА, sputnik.by, polymia.by (16.01).

Студэнты БДУ змогуць стаць ступендыятамі кампаніі Wargaming – БелТА, gp.by, news.21.by (04.01), news.yandex.by (05.01), zviazda.by (06.01), adukar.by (09.01), АНТ (15.01).

У БДУ распрацавана геаінфармацыйная сістэма аўтаматызаванага аналізу глеб Беларусі – БелТА, agronews.com, news.yandex.by (14.01), СТБ, zviazda.by, produkt.by (15.01), БТ-1 (17.01).

Унікальная вакцына «ЦырКол» для барацьбы з цырка-вірусным хваробай свіней распрацавана ў БДУ – gmpnews.ru, belfarmamed.ru, wuz.by, agas.farm (11.01), zviazda.by (13.01), probioteh.ru (15.01).

Рэспубліканскі літаратурны конкурс «Брамамар» стартуе ў БДУ – БелТА, dompressy.by (12.11.2018), mogilev-region.gov.by (13.11.2018), wuz.by (02.01), news.21.by (09.01), mstlife.by, pinsknews.by (13.01).

У БДУ плануецца ўвесці сацыяльныя зніжкі на абеды для студэнтаў – БелТА, sb.by, news.yandex.by, interfax.by (03.01), hoiniki.by (04.01), bobrlife.by (05.01), 1prof.by (09.01).

Сацыяльны праект БДУ free MOWA ганараваны гранпры Рэспубліканскага конкурсу Social Weekend – sb.by (20.12.2018), «Мінск-Навіны», wuz.by, goodstart.by (21.12.2018), interfax.by, wmeste.by (22.12.2018), zviazda.by (23.12.2018).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

УНІВЕРСІТЭТ
5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

ФОТА ВАСІЛЯ КУЗЬМІЧЭНА

Магчымасці!

Калі казаць пра ўніверсітэт адным словам

Падведзены вынікі конкурсу «Студэнт года БДУ–2018»

Экспертная камісія на чале з прарэктарам па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Іванам Янушэвічам разгледзела 48 заявак па 4 намінацыях: «Спорт» – 3 заяўкі, «Культура» – 6 заявак, «Навука» – 18 заявак і «Лідар» – 21 заяўка. У вызначэнні пераможцаў і лаўрэатаў конкурсу прынялі ўдзел начальнікі ўпраўленняў і падраздзяленняў БДУ, а таксама прадстаўнікі студэнцкага самакіравання.

У намінацыі «Спорт» пераможцам стала студэнтка 3 курса гістарычнага факультэта Вікторыя АНТОНАВА.

Кандыдат у майстры спорту па настольным тэнісе.

Уладальнік 1 месца ў Рэспубліканскай універсіядзе 2018 г. у камандным разрадзе.

Уладальнік 1 месца ў спартакіядзе Саюзнай дзяржавы 2018 г. для дзяцей і юнацтва ў камандным разрадзе.

Уладальнік 1 месца ў спартакіядзе Саюзнай дзяржавы 2018 г. для дзяцей і юнацтва ў асабістым разрадзе.

– Для мяне БДУ – магчымасць самарэалізавацца. Кожны студэнт можа знайсці тое, што яму падабаецца, і развівацца ў абраным кірунку. За час навучання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце я прыняла ўдзел у спартакіядзе Саюзнай дзяржавы, рэспубліканскай універсіядзе па настольным тэнісе, а таксама ўдзельнічала ў іншых спаборніцтвах. Дзякуючы настольнаму тэнісу, я пазнаёмілася з разумнымі і цікавымі студэнтамі з іншых факультэтаў БДУ.

Пасля 1 ступені вышэйшай адукацыі я планую паступіць у магістратуру і працягнуць развіваць свае прафесійныя якасці.

У намінацыі «Культура» найлепшым прызнаны студэнт 4 курса факультэта журналістыкі Канстанцін БАЯНДЗІН.

Пераможца фэсту эстрады БДУ 2017 г. у намінацыі «Размоўны жанр».

Пераможца конкурсу «Містар журфак» 2016 г.

Пастаянны ўдзельнік ўніверсітэцкіх і факультэцкіх мерапрыемстваў: «Віват, студэнт!», «Рэктарскі выпускны», фэст хароў «Папараць-кветка», «БДУ ў тваім фармаце», «PR-кветка».

– У першую чаргу дзякуючы БДУ я пачаў весці мерапрыемствы, прычым як ва ўніверсітэце, так і за яго межамі. Універсітэт – велізарны досвед, а таксама штуршок займацца чымсьці самастойна, каб стваральна і развівацца свае праекты. Ну і, вядома, БДУ нельга назваць скнарай, калі казаць пра заахвочванні, хай гэта будуць паездкі, выдатныя мерапрыемствы і іншыя бонусы.

У будучыні я хачу працягваць займацца тым, чым цяпер. У Студэнцкім саюзе БДУ я займаюся правядзеннем і арганізацыяй мерапрыемстваў, у мяне на журфаку спецыяльнасць «Інфармацыя і камунікацыя». Таму вельмі спадзяюся, што з тым досведам і навыкамі, якія ў мяне ўжо ёсць, у мяне атрымаецца дамагчыся поспеху ў гэтым кірунку.

У намінацыі «Навука» ўдзельнікі былі падзелены на 2 паднамінацыі.

У прыродазнаўча-тэхнічным кірунку пераможцам стала магістрант біялагічнага факультэта Дар'я КАРАЦЕЕВА.

Уладальнік дыплома II ступені на міжнароднай канферэнцыі (Львоў, Youth and progress in biology, 2018 г.).

Уладальнік дыплома лаўрэата XXIV Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў 2017 г.

– Безумоўна, БДУ дапамог мне раскрыцца і знайсці сваё месца, дзе мне зараз цікава і камфортна. Менавіта дзякуючы ўніверсітэту я змагла канчаткова вызначыцца са сваімі мэтамі ў жыцці, рэалізаваць свае магчымасці, убачыць і даведацца шмат новага. Спецыфіка тэматыкі маіх даследаванняў у вялікай колькасці палявых прац, дзякуючы чаму падчас збору матэрыялу я змагла наведаць шмат прыгожых месцаў у межах нашай краіны. Дзякуючы БДУ я брала ўдзел у самых разнастайных навуковых канферэнцыях – як рэспубліканскіх, так і міжнародных, таксама мне ўдалося два разы пабываць на стажыроўцы ва Уроцлаўскім універсітэце ў Польшчы.

Я б хацела працягваць займацца навуковай дзейнасцю на кафедры заалогіі біялагічнага факультэта, паступіць у аспірантуру, напісаць і абараніць кандыдацкую дысертацыю. Таксама хацелася б дамагчыся поспеху ў выкладанні, бо я першапачаткова паступала ва ўніверсітэт менавіта з мэтай у будучыні выкладаць.

У сацыяльна-гуманітарным кірунку пераможцамі былі абвешчаны:

• студэнтка 5 курса факультэта сацыякультурных камунікацый Стэфанія ЗМІТРАКОВІЧ.

Уладальнік дыплома Міністэрства адукацыі Беларусі ў XIV Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў (2018 г.).

Дыплом I ступені за найлепшае выступленне ў секцыі на 74 навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ (2017 г.).

Уладальнік дыплома II ступені за найлепшае выступленне ў секцыі на міжуніверсітэцкім навукова-адукацыйным форуме маладых перакладчыкаў «Моўная асоба і пераклад» (2016 г.).

– Для мяне паняцце «ўніверсітэт» можна апісаць адным словам – «магчымасць». Час вучобы ў БДУ быў напоўнены яркімі падзеямі і ўражаннямі. Адно з апошніх – валанцёрства на XXXI Міжнародным кангрэсе Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, якое прынесла не толькі прыемныя знаёмствы і незабыўныя эмоцыі, але і было карысным у прафесійным плане, таму што дало магчымасць вывяўіць сябе ў ролі перакладчыка. Іншы важны аспект майго студэнцтва – гэта навуковая дзейнасць, а менавіта напісанне артыкулаў на тэму ўспрымання гумару на роднай і замежных мовах. Як вынік – перамога ў леташнім і сёлетнім годзе на рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў, што не можа не цешыць. Нягледзячы на тое, што ўвесь працэс быў досыць працаёмкім, дзякуючы займальнаму аб'екту даследаванняў і цікавасці да вывучэння замежных моў, ён дапамог мне адкрыць у сабе журналісцкія здольнасці і рэалізаваць шмат якія са сваіх ідэй.

Мне падабаецца працаваць з мовамі, таму я маю намер звязаць з імі і сваю далейшую кар'еру. Мінулым летам мне пашчасціла праходзіць стажыроўку ў адным з прадстаўніцтваў міжнародай арганізацыі, дзе я выконвала абавязкі перакладчыка і брала ўдзел у падрыхтоўцы шэрагу мерапрыемстваў. Паколькі мне даводзілася выкарыстоўваць не толькі наяўныя веды падчас працы з тэкстамі, але і вучыцца новаму, напрыклад, адным з заданняў з'яўлялася распрацоўка тэматычнага буклета, то я б і хацела працягнуць удасканальвацца як прафесіянал у дадзеным кірунку.

• магістрант юрыдычнага факультэта Эльжбета СКШЫДЛЕЎСКА.

Уладальнік дыплома пераможца «Конкурсу 2018 года на прыз імя У. Д. Спасовіча» ў намінацыі «Студэнцкая навука».

Уладальнік дыплома I ступені міжнароднага конкурсу «Найлепшыя навуковыя тэзісы –2018» (г. Казань).

Уладальнік дыплома пераможца міжнароднага конкурсу «Найлепшае студэнцкае даследаванне–2018» (г. Казань).

Уладальнік дыплома пераможца VII Усерасійскага конкурсу даследчых прац маладых навукоўцаў па параўнальным правазнаўстве ў намінацыі «Параўнальнае працэсуальнае права» (МДІМА, г. Масква, 2017 г.).

– За час вучобы ў БДУ атрымалася зрабіць многае: прыняць удзел у 72 канферэнцыях, з іх 43 за мяжой, падрыхтаваць 62 навуковыя публікацыі, стаць удзельнікам шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў навукова-даследчых прац.

Прадстаўляючы наш універсітэт, прыняць удзел у міжнародай летняй школе ў Казахстане (Астана) і міжнародай школе публічнай дыпламатыі ў Арменіі (Агверан), а таксама ў VIII міжнародным летнім універсітэце БДУ.

Акрамя таго, у 2018 годзе атрымалася наведаць міжнародны моладзевы адукацыйны форум «Еўразія», які праводзіўся ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.

БДУ дае нам вялізарную колькасць магчымасцяў, аднак памятайце, што іх рэалізацыя залежыць ад нас саміх.

Поспехаў у дасягненні пастаўленых мэт!

Пераможцам у намінацыі «Лідар» (паднамінацыя «Факультэт») стала студэнтка 4 курса юрыдычнага факультэта Хрысціна КАНАНОВІЧ.

Суарганізатар Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды, фэсту мастацтваў юрыдычнага факультэта «Фабрыка зорак», конкурсу «Багіня Феміда», конкурсу «Міс юрфак», сутычкі першакурснікаў юрыдычнага факультэта БДУ, дня нараджэння юрфака БДУ.

Уладальнік падзякі дэкана юрыдычнага факультэта за актыўны ўдзел у грамадскім і творчым жыцці факультэта, добрасумленнае выкананне абавязкаў старасты групы.

Уладальнік граматы за актыўны ўдзел у дзейнасці органаў студэнцкага самакіравання Студэнцкага гарадка БДУ (2018 г.).

– Для мяне ўніверсітэт – гэта адпраўны пункт, дзе я атрымала неацэнную падтрымку ва ўсіх маіх пачынаннях. Гэта не проста месца, дзе можна навучыцца будучай прафесіі. Студэнцкія гады – надзвычайная платформа для ўдасканалення сваіх уменняў і самавыяўлення, калі кожны студэнт, яшчэ не патраціўшы жыццёвы запал, ініцыятыву і энергію, можа развівацца не толькі як спецыяліст, але і як асоба. На працягу вучобы я значную частку часу аддавала сваёй улюбёнай справе – танцам – у якасці кіраўніка танцавальнай студыі БДУ. Аднак танцамі мая дзейнасць ва ўніверсітэце не абмежавалася. Я ўдзельнічала ў грамадскім жыцці ўніверсітэта, уклаўшы сябе ў шматлікія праекты, конкурсы і фэсты, дзе атрымала неацэнны досвед і дасягнула пэўных вышынь, за што была ўзнагароджана дыпломам II ступені на ўніверсітэцкім этапе конкурсу «Студэнт года–2018», дыпломам найлепшага студэнта ў намінацыі «Гонар юрыдычнага факультэта–2018»; стала пераможцам у намінацыі «Лідар» (паднамінацыя «Факультэт») на конкурсе «Студэнт года БДУ–2018».

На выпускным курсе юрыдычнага факультэта БДУ я ўсведамляю, наколькі даладным было маё рашэнне стаць кваліфікаваным юрыстам, якое я прыняла чатыры гады назад, паступаючы ва ўніверсітэт. Менавіта тамы сваё жыццё я хачу звязаць з юрыспрудэнцыяй. Юрфак падарыў мне каштоўны вопыт. Не толькі вывучэнне неабходных дысцыплін, але і праца ў студэнцкіх арганізацыях БДУ і актыўная грамадская дзейнасць выпрацавалі ўва мне якасці і навыкі, так неабходныя для добрага юрыста. У першую чаргу гэта тычыцца арганізатарскіх навыкаў, стрэсаўстойлівасці, умення хутка прымаць правільныя рашэнні, камунікабельнасці, якія я выпрацавала ў сабе за той перыяд, калі была моладзевым лідарам у арганізацыях самакіравання ўніверсітэта.

Перамогу ў паднамінацыі «Універсітэт» атрымалі:

• магістрант гістарычнага факультэта Артур КАНДРАЦЕНКА.

Старшыня Студэнцкай асамблеі БДУ.

Старшыня студэнцкага савета па якасці адукацыі БДУ.

Член грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета пры Міністэрстве адукацыі.

Член Моладзевай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Член савета ўніверсітэта.

Уладальнік дыплома конкурсу «Найлепшы выпускнік БДУ–2017» у намінацыі «Студэнцкі лідар».

– Студэнцкія арганізацыі – гэта ідэальная платформа для задавальнення не толькі грамадскіх, але і навуковых інтарэсаў. Так, студэнцкі савет па якасці адукацыі даў мне неацэнны досвед камунікацыі з кампетэнтнымі людзьмі, навыкі арганізацыі мерапрыемстваў. Мая мэта – працаваць дзеля нашага ўніверсітэта. У першую чаргу я бачу сябе выкладчыкам. Мяркую, што гэта адзін з найлепшых варыянтаў для маёй самарэалізацыі, бо ў гэтай прафесіі спалучаюцца зносіны з людзьмі і бясконцы пошук ісціны. БДУ – гэта вялікая моцная сям'я са сваімі традыцыямі і каштоўнасцямі. Я веру, што кожны з нас будзе гарантам будучыні нашай альма-матар.

• студэнт 4 курса механіка-матэматычнага факультэта Максім ШАЛЮТА.

Суарганізатар выязнога семінара-практыкума «Школа студэнцкага актыву Студэнцкага гарадка БДУ» (красавік 2016 г.), рэспубліканскага семінара «Інтэрнат: плюсы, вольны час, выхаванне (кастрычнік 2016 г.), рэспубліканскага семінара «Удасканаленне нарматыўнай базы па прадстаўленні інтэрнатаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі» (снежань 2017 г.), VI Міжуніверсітэцкага фэсту нацыянальных культур Студэнцкай вёскі (лістапад 2018 г.).

Старшыня каардынацыйнага савета органаў студэнцкага самакіравання Студэнцкага гарадка БДУ.

Уладальнік падзякі рэктара БДУ «За асабісты ўнёсак у развіццё студэнцкага самакіравання Студэнцкага гарадка».

– Вучоба ў БДУ для мяне – гэта вынік аднаго важнага кроку, які я калісьці зрабіў, не задумваючыся, што ён мяне прывядзе да таго, што цяпер маю: класныя сябры, прыемныя знаёмствы, карысны досвед, доказ таго, што прадстаўнікі адміністрацыі могуць быць яшчэ і добрымі настаўнікамі, і дарадцамі. У красавіку 2015 года я вырашыўся паступаць у БДУ і думаў выключна пра тое, што гэта прэстыжна, але запомніща гэта толькі тым, што я там вучыўся. І тут я памыляўся. БДУ – гэта адна вялікая сям'я, якая, акрамя спецыяльнасці і дыплома, дорыць прыемныя эмоцыі, яркія ўспаміны і досвед, якога нідзе не набярэшся.

Пасля 4 курса планую ісці ў магістратуру і не спыняцца ў сваім асобасным развіцці. Буду вучыцца і працаваць са спадзяваннем на тое, што ў будучыні веды і досвед дапамогуць адкрыць сваю справу (пра якую так даўно мару) і займацца тым, што будзе прыносіць задавальненне і прыбытак.

АКРАМЯ ТАГО:

У намінацыі «Спорт» лаўрэатамі сталі студэнтка 2 курса біялагічнага факультэта **Аляксандра СПРЫНА** і студэнтка 2 курса факультэта прыкладнай матэматыкі і інфарматыкі **Ганна ГАНЧАР.**

У намінацыі «Культура» лаўрэатамі сталі магістрант факультэта журналістыкі **Валерыя КАЗЛОВА** і студэнт 3 курса гістарычнага факультэта **Аляксандр ПАРШАНКОЎ.**

У намінацыі «Навука» ўдзельнікі былі падзелены на 2 паднамінацыі.

У прыродазнаўча-тэхнічным напрамку лаўрэатамі былі прызнаны студэнт 4 курса факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій **Мікіта НЯЧАЕЎ** і студэнт 5 курса хімічнага факультэта **Аляксей БАКАВЕЦ.**

У сацыяльна-гуманітарным напрамку журы прыняло рашэнне вылучыць па 1 пераможцу і лаўрэату на першай ступені адукацыі і другой ступені адукацыі. Лаўрэатамі сталі студэнтка 3 курса эканамічнага факультэта **Юлія АТРОШЧАНКА** і магістрант філалагічнага факультэта **Ангеліна ГЕРУС.**

Самай папулярнай сёлета стала намінацыя «Лідар». Тут таксама ўдзельнікі былі падзелены на 2 паднамінацыі: «Факультэт» і «Універсітэт».

У паднамінацыі «Факультэт» лаўрэатамі сталі:

• студэнтка 3 курса Інстытута бізнесу БДУ **Аліна БАРАНАВА**;

• студэнтка 4 курса факультэта журналістыкі **Паліна ДАЎГІЛЕНКА**;

• студэнтка 4 курса факультэта журналістыкі **Валерыя СЦЯЦКО**;

• студэнтка 4 курса Інстытута бізнесу БДУ **Алена ЧУДЗІНАВА**;

• студэнтка 3 курса хімічнага факультэта **Юлія БАЯРСКІХ**;

• студэнтка 4 курса факультэта журналістыкі **Надзея МАРХЕЛЬ**.

Лаўрэатамі ў паднамінацыі «Універсітэт» экспертная камісія прызнала:

• студэнтку 4 курса факультэта журналістыкі **Лідзію ЗАБЛОЦКУЮ**;

• студэнта 4 курса факультэта сацыякультурных камунікацый **Ягора БАГДАШОВА**;

• студэнтку 4 курса эканамічнага факультэта **Дыяну КАВАЛЁВУ**.

Падрыхтаваў Антон КУПЧЫН

УНІВЕРСІТЭТ
5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

«Ставім мэту – выпускаць кожны год па кандыдату»

Герой праекта «Новы погляд» загадчык кафедры высокамалекулярных злучэнняў хімфака і кіраўнік лабараторыі каталізу полімерызацыйных працэсаў **Сяргей КАСЦЮК** адзначае, што, каб мець поспех у сваёй галіне, трэба любіць працу, крэатыўна думаць і часцей публікавацца ў аўтарытэтных часопісах. Пагаварылі пра міжнародныя праекты, універсітэт і творчасць у хіміі.



С. В. Касцюк і аспірант П. А. Нікішаў перад абаронай кандыдацкай дысертацыі

Сяргей Касцюк – выпускнік хімічнага факультэта БДУ 1999 г. Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам у лабараторыі фізічнай хіміі і мадыфікацыі цэлюлозы, адначасова навучаўся ў аспірантуры. Кандыдацкую дысертацыю абараніў на тэму «Жывая» катыённая полімерызацыя стыролу ў прысутнасці электронадонарных злучэнняў» у 2002 г., а доктарскую – на блізкую тэму «Дызайн новых каталітычных сістэм для катыённай полімерызацыі вінілавых манамераў» у 2018 г.

– Пад маім кіраўніцтвам у 2008 г. стварылася лабараторыя каталізу полімерызацыйных працэсаў у НДІ фізіка-хімічных праблем. У лабараторыі праводзім даследаванні ў галіне сінтэзу палімераў, распрацоўваем новыя падыходы для іх атрымання. Займаемся пошукам новых каталітычных сістэм для атрымання палімераў не толькі тэхнічнага, але і медыцынскага прызначэння, – распавядае Сяргей Віктаравіч. – Наступнай важнай прыступкай у маёй кар'еры стала тое, што летась я ўзначаліў кафедру высокамалекулярных злучэнняў, калектыў – 7 чалавек. На кафедры навуковая праца праводзіцца ў двух кірунках: класічная палімерная хімія і біяхімія.

Навуковец робіць акцэнт на тым, што такія структуры, як НДІ ФХП і яго лабараторыі, факультэт і кафедры, варта разглядаць як адзінае цэлае. Яны ўзаемадзейнічаюць даволі цесна. Напрыклад, НДІ не можа браць аспірантаў, таму тыя навучаюцца на кафедры. Маладыя навукоўцы працуюць на базе кафедры і лабараторыі.

– У лабараторыі НДІ ФХП працуе 16 супрацоўнікаў. Сярод іх студэнты 2-4 курсаў, магістранты, аспіранты, – пералічвае кіраўнік С. В. Касцюк. – У нас дзейнічае такая палітыка: прыходзяць студэнты, яны сябе праяўляюць, мы іх падтрымліваем, навучаем, пасля яны ідуць у аспірантуру ад кафедры. У нас практычна ўсе аспіранты абараняюцца ў тэрмін.

Пра лекцыі ў Кітаі і палімеры медыцынскага прызначэння

Інтарэсы С. В. Касцюка звязаны з вывучэннем кантраляванай іоннай полімерызацыі, катыённай і іоннакаардынацыйнай полімерызацыі. Выступаў як запрошаны лектар на міжнародных канферэнцыях і семінарах у розных краінах, чытаў курс лекцый па кантраляванай катыённай полімерызацыі ў Каўнаскім тэхналагічным універсітэце (Літва) і ў Чжэцзянскім Шужэн універсітэце (Ханчжоу, Кітай), быў кіраўніком некалькіх міжнародных праектаў.

– Пад маім кіраўніцтвам выконваўся і абараняўся шэраг дыпломных і магістарскіх прац, – кажа хімік. – Абараніліся тры аспіранты, адзін прайшоў перадабарону нядаўна, 15 студзеня, яшчэ двое рыхтуюць дысертацыі. Ставім мэту на будучыню – выпускаць кожны год па кандыдату. Сакрэты і падыходы ў падрыхтоўцы аспірантаў заключаюцца ў зацікаўленасці навуковага кіраўніка і аспіранта ў атрыманні новых навуковых вынікаў. У нас склаўся сяброўскі калектыў як на кафедры, так і ў лабараторыі. Гэта вялікі плюс, таму што, калі чалавеку камфортна працаваць у калектыве, яго дзейнасць становіцца ў разы больш эфектыўнай.

З цікавых апошніх распрацовак кіраўнік вылучае атрыманне палімераў медыцынскага прызначэння:

– Цяпер мы шчыльна супрацоўнічаем з Сечанаўскім медыцынскім універсітэтам і іншымі ўніверсітэтамі Расіі, а таксама навукова-даследчымі цэнтрамі Ірландыі, Германіі ў галіне рэгенератыўнай медыцыны. Гэта праца комплексная, у ёй удзельнічаюць 8 розных цэнтраў. Распрацоўваем спецыяльныя біядэградацыйныя дробнапорыстыя матрыксы (скафалды) для аднаўлення касцяной тканкі. Такія трохмерныя скафалды з'яўляюцца своеасаблівай апорай для росту клетак. Па меры аднаўлення касцяной тканкі скафалд паступова дэградуе да нетаксічных для арганізма злучэнняў. У выніку адбываецца поўнае аднаўленне касцяной тканкі. Мы сінтэзуем палімерныя матэрыялы з зададзенымі ўласцівасцямі, фізікі атрымліваюць скафалды на іх аснове, а медыкі ацэньваюць іх эфектыўнасць у аднаўленні косткі. Пакуль гэта тэхналогія яшчэ не ўкаранёная, даследаванні працягваюцца.

Планаванне эксперыменту

Катыённая полімерызацыя анетолу

Калі чалавеку камфортна працаваць у калектыве, яго дзейнасць становіцца ў разы больш эфектыўнай!

Пра праекты з BASF, EURENCO і «Гарызонт 2020»

– Летась з найбуйнейшым у свеце хімічным канцэрнам – фірмай BASF (спадзяёмся, супрацоўніцтва працягнецца ў 2019) – у нас скончыўся кантракт, накіраваны на пошук новых каталізатараў для атрымання дадаткаў у маторныя маслы і паліва. За шматгадовую сумесную працу з фірмай мы выканалі 7 кантрактаў, падрыхтавалі 2 агляды, апублікавалі больш за 15 артыкулаў у часопісах з высокім імпакт-фактарам, атрымалі каля 10 сумесных патэнтаў, – распавядае навуковец.

Працягнецца праца з французскай кампаніяй EURENCO. Навукоўцы хімфака і НДІ ФХП БДУ паляпшаюць спосаб сінтэзу палімераў, якія выкарыстоўваюцца ў якасці злучнага пры вытворчасці ракетнага паліва. Атрымаць міжнародны кантракт на правядзенне даследаванняў дазволілі кантакты, якія былі наладжаны Сяргеем Віктаравічам яшчэ тады, калі ад 2005 па 2014 год працаваў па грандах INTAS, HATA, ANR і інш. у Францыі.

Летась яны атрымалі фінансаванне па рамачнай праграме Еўрапейскага саюза «Гарызонт 2020». У праекце (2019–2022 гг.) апроч лабараторыі НДІ ФХП яшчэ будуць удзельнічаць каля 15 лабараторый з розных краін. Праект накіраваны на сінтэз новых арганічных ці палімерных флуарэсцэнтных матэрыялаў для святлодыёдных прылад і арганічных лазераў.

Апроч гэтага ўдзельнічаюць у праграмах Еўрапейскага саюза (Erasmus, DAAD, «МОСТ»). Па праграме Erasmus летась студэнты і супрацоўнікі кафедры і лабараторыі ездзілі ў Германію па тэме іоннай полімерызацыі. Пры фінансавай падтрымцы праграмы «МОСТ» прынялі ўдзел у значнай канферэнцыі па іоннай полімерызацыі (IP–2018) у Дарэмскім універсітэце (Вялікабрытанія) і стажываліся ў Францыі і Польшчы.

– У кожным праекце, хоць яны ўсе і розныя, мы займаемся тым, што добра ўмеем: сінтэзам палімераў. Можна сказаць з гонарам, што мы адны з найлепшых у галіне іоннай полімерызацыі, – каментуе загадчык. – У планах – наладзіць яшчэ больш кантактаў для супрацоўніцтва, а таксама падтрымліваць ужо складзеныя дамовы.

Пра погляд на навуку

– Навука – такая ж творчасць, як пісаць добрыя песні. Вядома, тут ёсць пэўная спецыфіка: апісанне ў артыкуле павінна быць выразным, без літаратурных вольнасцяў. Самая вялікая мара – каб з'явілася больш часу для творчасці, каб сесці, падумаць, напісаць, – кажа навуковец.

Сяргею Віктаравічу ў навуцы болей за ўсё падабаецца штосьці прыдумляць. Навука адштурхоўваецца ад ідэі, любая думка павінна пацвярджацца эксперыментальна. Па яго словах, хімія – гэта досыць ёмісты прадмет. Шмат увагі патрабуе падрыхтоўка да эксперыменту. Часам гэта займае некалькі гадзін, а сама рэакцыя працякае дзясятак секунд. Потым аналізуеш, пішаш артыкул. Напрыклад, з досведу героя публікацыі, адзін эксперымент праводзіўся гады назад, а на напісанне самога артыкула сышла пара гадоў.

– Як дамагчыся поспеху ў навуцы? Адказ такі: 10 % таленту, а ўсё астатняе – працавітасць. Трэба любіць сваю працу, крэатыўна думаць. Публікацыі ў часопісе – гэта твой рэпутацыйны капітал. Добры рэйтынг дапаможа атрымаць фінансаванне, запрашэнні ў праекты. Удзел у канферэнцыях – гэта таксама важны элемент, – разважае герой матэрыялу.

Пра БДУ

– Мне ёсць з чым параўнаць, працаваў у некалькіх краінах, таму магу сказаць, што БДУ – найлепшая ВНУ Беларусі. Лічу, што хімфак дае добрую адукацыю, рыхтуем мэтанакіравана навукоўцаў. Пацвярджэнне таму тое, што многія выпускнікі сталі паспяховымі спецыялістамі галіны.

Алена ЛЯЎШЭНЯ
Фота Таццяны БАГАМАЗАВАЙ

Даведка

Палімеры, або высокамалекулярныя злучэнні, з'яўляюцца асноўнай сыравінай для вытворчасці пластмас, гумы, сінтэтычных валокнаў. Яны прымяняюцца ў бытавой і тэхнічнай сферы, у ахове здароўя, будаўніцтве і інш. Хімія палімераў здольная стварыць матэрыялы больш трывалыя, чым сталь, лягчэйшыя за пробку, больш эластычныя і моцныя, чым прыродны каўчук, больш даўгавечныя, чым дрэва ці камень.

УНІВЕРСІТЭТ
5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

Навуковы кіраўнік не павінен быць абыякавым

Летась у аспірантуры БДУ адбыўся ўнікальны выпадак: пад кіраўніцтвам кандыдата фізіка-матэматычных навук **Алены МЕЛЬНІКАВАЙ** у тэрмін абараніліся адразу дзве аспіранткі кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі фізфака **Вольга Кабанава** і **Ірына Рушнова**. Яны займаліся тэмай распрацоўкі і стварэння вадкакрышталічных элементаў інтэгральнай фатонікі і сталі кандыдатамі навук у адзін дзень. Не хаваючы гонару за вучаніц, Алена Аляксандраўна распавяла пра свой стыль эфектыўнага навуковага кіраўніцтва аспірантамі.

Фота Вацлава КУДЫРКІНА

«Студэнтам я заўсёды кажу, што яны не горшыя, чым хтосьці, проста менш ведаюць і ўмеюць, трэба працаваць»

– Дзяўчаты прыйшлі займацца навуковай працай яшчэ студэнткамі: Ірына на трэцім курсе, Вольга крыху пазней – на чацвёртым. Яны абедзве пачалі працаваць над тэмай электраоптыкі вадкіх крышталяў на чацвёртым курсе ў рамках курсавых прац. Яе працягнулі ў сваіх дыпломных, затым у магістарскіх працах і ўсе атрыманыя веды і досвед уклалі ў кандыдацкія дысертацыі. Калі наша праца пачыналася, яны былі для мяне, па сутнасці, дзецьмі, якія і пра ваткі крышталь толкам нічога не ведалі. І тут галоўнае было не толькі пазнаёміць іх з гэтымі ўнікальнымі асяроддзямі, але і здолець матываваць іх на працу, ад гэтага ў першую чаргу залежыць поспех. Я не магу ставіцца фармальна да людзей, з якімі працую, разумею, што ўсе мы розныя. Мы па-рознаму рэагуем на падзеі, што адбываюцца і дома, і на працы. Кагосьці няўдачы астуджаюць, камусьці дадаюць зарад. Працуючы з дзяўчатамі, я імкнулася прасякнуцца ўсімі кірункамі іх жыцця, быць да іх бліжэй. Бывае, убачыш сумныя вочы – пагаворыш, штосьці падкажаш, падбадзёрыш. У любой справе самае важнае, каб чалавек у сябе паверыў. Так мы паступова пачалі паглыбляцца ў тэму і вучыцца майстэрству навуковага даследавання.

«Не трэба хвалявацца, галоўнае – верыць у сябе»

– Працы маіх аспірантак эксперыментальныя, акрамя таго, іх вылучае тое, што трэба было стварыць сам аб'ект даследавання – вадкакрышталічны элемент. У яго вельмі складаная тэхналогія вырабу, якая патрабуе пэўных умоў вытворчасці, пачынаючы ад ідэальнай чысціні памяшкання (адна парушынка прывядзе да таго, што крышталь будзе арыентавацца інакш), заканчваючы строга рэгламентаванымі фізічнымі ўмовамі. У той час у мяне быў аспірант, які меў дастатковую кваліфікацыю для вырабу падобных элементаў. Дзяўчаты глядзелі на працэс вялікімі спалоханымі вачыма і казалі: «У нас так ніколі не атрымаецца». А я ім: «Спакойна! Не трэба хвалявацца, галоўнае – верыць у сябе». Першае, што яны навучыліся рабіць – рэзаць шкельцы для гэтых ячэек, праца, прама скажам, не жаночая.

Кожны этап навуковай працы павінен быць даведзены да лагічнага канца і мець сваю ацэнку. Навуковыя працы дзяўчат неаднаразова ўзнагароджваліся дыпломамі вышэйшай ступені на рэспубліканскіх конкурсах на найлепшую студэнцкую працу. Ірына двойчы з'яўлялася лаўрэатам трэцяй прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў і занесена ў банк дадзеных адоранай моладзі БДУ, з'яўлялася кіраўніком навукова-даследчага праекта па гранце БДУ і праекта, выкананага за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжанага Міністэрствам адукацыі. У 2016 годзе дзяўчатам была прызначана стыпендыя Прэзідэнта РБ аспірантам і таленавітым маладым навукоўцам. Вядома ж, гэта стала для іх магутным стымулам, і яны ішлі наперад, з кожным днём набіраючы сілы. Яны працавалі ад раніцы да вечара, і ў выніку ў нас усё атрымалася.

Ірына РУШНОВА, навуковы супрацоўнік кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі

– Першапачаткова я не планавала займацца навукай, але студэнткай на трэцім курсе патрапіла на кафедру, пачала шчыльна працаваць з маім навуковым кіраўніком Аленай Аляксандраўнай, таксама дапамагаў і накіроўваў наш загадчык Аляксей Леанідавіч Толсцік. Я лічу, што галоўная задача навуковага кіраўніка ў аспірантуры – гэта правільна паставіць задачу падапечнаму, задаць кірунак. На сваім досведзе магу сказаць, што нам заўсёды дапамагалі, спрыялі. Але, вядома, не трэба забываць, што ў напісанне кандыдацкай працы велізарны ўнёсак робіць сам аспірант, а кіраўнік неабходны, каб скарэкціраваць важныя аспекты.

Вольга КАБАНАВА, навуковы супрацоўнік кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі:

– Я прыйшла на кафедру на чацвёртым курсе. Спадабалася, што тут працавала згуртаваная група. Пачала паступова ўключацца ў тэму вадкіх крышталяў і падчас працы ўсвядоміла, што хачу і далей займацца даследаваннямі. Лічу, што навуковы кіраўнік іграе важную ролю падчас фарміравання маладога спецыяліста. На мой погляд, аспіранту, які аддадзены толькі сам сабе, будзе складана працаваць эфектыўна. У нашай навукова-даследчай групе пад кіраўніцтвам Алены Аляксандраўны рэгулярна праводзіліся працоўныя семінары, дзе аспіранты выступалі з прэзентацыямі і абмяркоўвалі атрыманыя вынікі. Важна, што падчас працы была наладжана пастаянная камунікацыя з навуковым кіраўніком.

«Сёння ў прыкладной працы па фізіцы ты нічога не зробіш па адным»

– Дысертацыйныя працы дзяўчат маюць прыкладны характар, г. зн., яны накіраваны на рашэнне фізічных задач для канкрэтных тэхналагічных і практычных прымяненняў.

Дзяўчаты, вядома, малайчыны. Яны паверылі ў сябе і шмат часу аддавалі працы, але нічога б не выйшла, калі б не навуковая група, у рамках якой мы працавалі. Саліст можа быць выбітным, але калі аркестр дрэнна сыграе, то выступленне не атрымаецца, – так і ў нашым выпадку. Прыкладны характар навуковых даследаванняў, праведзеных дзяўчатамі, патрабаваў пэўнай калабарацыі са спецыялістамі ў розных галінах фізікі і хіміі. Падчас навуковых даследаванняў мы супрацоўнічалі з калегамі, якія займаюцца асяроддзямі, што арыентуюць вадкі крышталь: група прафесара Уладзіміра Магільнага (кафедра фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі), група Аляксандра Мураўскага (Інстытут хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі), лабараторыя оптыкі кандэнсаваных асяроддзяў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі. Дзякуючы падтрымцы і дапамозе калегаў, усе кампаненты, неабходныя для стварэння вадкакрышталічных элементаў, пачынаючы ад шкельцаў са складаным электродамі і самі вадкакрышталічных асяроддзяў да неабходнага тэхналагічнага абсталявання, мы знаходзілі ў нас у краіне.

Нашы працы эксперыментальныя, аднак мы працавалі ў цесным супрацоўніцтве з тэарэтыкамі (дацэнт А. Г. Раманаў, прафесар І. А. Ганчарэнка), якія навучылі аспірантак мадэляваць доследныя працэсы, будаваць матэматычныя мадэлі, каб параўнаць эксперымент з тэорыяй.

Асобна хачу падзякаваць нашай навуковай групе пад кіраўніцтвам прафесара А. Л. Толсціка за каштоўныя навуковыя дыскусіі і рэкамендацыі. Велізарная падзяка таксама і нашай кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, супрацоўнікі якой актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні вынікаў прац на ўсіх этапах іх напісання.

«Для таго, каб падапечны паверыў у сябе, трэба ўвесь час быць побач»

– Ва ўсіх выкладчыкаў ёсць пэўная навучальная нагрузка. На кіраўніцтва дыпломнай працай вылучаецца 50 акадэмічных гадзін у навучальным годзе. Калі паглядзець па аспірантуры, то гэта 150 акадэмічных гадзін за ўвесь тэрмін навучання, гэта значыць, каля шасці сутак. Вядома, калі фармальна кіраваць толькі ў рамках гэтага часу, то нічога не атрымаецца. Магчыма, у гуманітарных спецыяльнасцяў свая спецыфіка, але калі мы кажам пра эксперыментальную працу фізіка, то гэтых гадзін вельмі мала. Я імкнулася быць побач з падапечнымі кожны дзень. Кожнаму этапу працы ў падрыхтоўцы маладога навукоўца трэба надаваць належную ўвагу, разбірацца, калі штосьці не атрымліваецца, шукаць прычыны няўдач, дапамагаць і накіроўваць.

«Мне прасцей і хутчэй напісаць навуковы артыкул самой, але тады не атрымаецца выгадаваць гатовых спецыялістаў»

– Я выкладаю і бачу, што сёння для студэнтаў праблематычна на вербальным узроўні фармуляваць свае думкі. Гэта вылізваецца і ў праблему напісання навуковых артыкулаў. Калі мы пачыналі працаваць з дзяўчатамі, прыйшлося вучыць іх і гэтаму неабходнаму для даследчыка аспекту працы. Вядома, мне было прасцей і хутчэй сесці і напісаць тэзісы ці артыкул па выніках працы самой, але тады пра якую перадачу ведаў і ўменняў іншым пакаленням можна казаць? Мне было важна, каб мае аспіранткі не фармальна абаранілі дысертацыю, а сталі сапраўднымі спецыялістамі. І мы працавалі так: дзяўчаты пішуць тэкст, дасылаюць мне, я вылучаю тое, што мне не падабаецца, выпраўляю. З часам мне даводзілася рэдагаваць тэксты ўсё менш і менш.

А калі нашы працы сталі адзначаць на аўтарытэтных міжнародных канферэнцыях і прымаць у высакарэйтынгавых міжнародных часопісах – гэта пацвердзіла, што мы працуем у перспектыўным навуковым кірунку і нашы працы актуальныя не толькі ў блізкім замежжы, але і прызнаюцца сусветнай навуковай супольнасцю, што вельмі натхніла дзяўчат.

Валерыя БАНДАРЧЫК

УНІВЕРСІТЭТ
5 лютага 2019 года, № 3 (2209)

Міжнародны конкурс International Public Speaking Competition

Па веды ў ПВТ

Лекцыі і лабараторныя работы

Экскурсія ў музей гісторыі БДУ

Першая зімовая школа па фізіцы і матэматыцы для кітайскіх студэнтаў

У нашу ВНУ прыязджалі 18 кітайскіх студэнтаў першага і другога курса Сумеснага інстытута Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта і БДУ, дзе маладыя людзі навучаюцца па спецыяльнасцях «Прыкладная фізіка» і «Інжынерная механіка». З 15 да 25 студзеня на базе фізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў замежныя студэнты слухалі лекцыі выкладчыкаў, выконвалі заданні, пазнавалі краіну і ўніверсітэт.

Падобная школа ўжо прайшла ўлетку на базе Далянскага ўніверсітэта, тады 18 нашых студэнтаў выязджалі ў Далянь. Амаль праз паўгода – візіт у адказ. У гэтыя дні ў раскладзе гасцей БДУ былі і лекцыі, і лабараторныя працы, і міжнародны конкурс. Працоўная мова школы – англійская.

Падрабязней пра праграму школы распавяла **Галіна ПУСЯНКОВА, старшы выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, каардынатар і выкладчык зімовай школы Сумеснага інстытута:**

«Праграма зімовай школы распрацавана такім чынам, каб нашы кітайскія сябры наведалі лекцыі і лабараторныя працы па англійскай мове, ядзернай фізіцы, па кіраванні ядзерным рэактарам, па матэматычных метадах апрацоўкі і аналізу эксперыментальных дадзеных, па геаінфармацыйных сістэмах і геамеханіцы, мехатроніцы. Даведаліся пра сучасныя даследаванні па механіцы і трыбафатыцы, наведалі заняткі па адытыўнай тэхналогіі 3D-мадэлявання і друку ў механіцы, а таксама па аналітычным мадэляванні ў біямеханіцы. Беларускія студэнты выступілі з прэзентацыямі пра нашу краіну, універсітэт, факультэты, такім чынам, разам са слухачамі параўналі дзве сістэмы навучання.

Для кітайскіх студэнтаў падрыхтавалі разнастайную экскурсійную праграму (Мінск, Дудуткі, музеі БДУ, Парк высокіх тэхналогій, «Вялікі камень»). Дапоўніць уражанні пра Беларусь, БДУ дапамаглі нашы студэнты, якія таксама працавалі над арганізацыяй і правядзеннем зімовай школы. Асабліва прыемна, што студэнты двух універсітэтаў пасябравалі. Паводле плана мерапрыемстваў школы, кітайскія студэнты ў супрацоўніцтве з нашымі студэнтамі падрыхтавалі і абаранілі праект, у якім падзяліліся сваімі ўражаннямі пра краіну, універсітэт, факультэты, заняткі, беларускіх сяброў.

Выніковым мерапрыемствам зімовай школы стала правядзенне міжнароднага конкурсу International Public Speaking Competition, у якім паўдзельнічалі найлепшыя кітайскія і беларускія студэнты. Яны расказвалі пра ўнёсак выбітных навукоўцаў сваёй краіны ў развіццё сусветнай навукі. Па выніках конкурснага мерапрыемства пераможцы ўзнагароджаны дыпломамі 1, 2, 3 ступені».

Марыя ЦЕРАХАВА, магістрантка фізфака: «Я вельмі рада прыняць удзел у працы зімовай школы Сумеснага інстытута. Мы паспрабавалі зрабіць усё так, каб нашы госці з Кітая абавязкова прыехалі да нас яшчэ. Асабіста для сябе бачу карысць удзелу ў зімовай школе ў тым, што магу наладзіць кантакты з кітайскімі сябрамі, а таксама развіць узровень гутарковай англійскай мовы».

Арцемій ЮШКЕВІЧ, студэнт 3 курса фізфака:

«Думаю, абмен досведам – гэта важная частка навучання, таму што так з'яўляецца магчымасць не толькі ўбачыць сістэму адукацыі, але і ўключыцца ў яе. Гэтым летам я ўдзельнічаў у сумеснай летняй школе ў Далянскім універсітэце. Для мяне гэта быў зусім іншы свет: і Кітай, і летняя школа, і ў прынцыпе адукацыйная мадэль ва ўніверсітэце. Усё было настолькі дзівосна, што толькі на пяты дзень я зразумеў, што знаходжуся ўсё яшчэ ў кампусе ўніверсітэта, а не ў горадзе, таму што кампус быў вельмі вялікі».

Дзякуючы выразнай арганізацыі і суладнай працы ўсіх удзельнікаў, зімовая школа атрымала станоўчы водгук з боку кітайскіх гасцей, якія выказалі спадзяванне на далейшае правядзенне падобных сустрэч.

Лю СУЛІН, прадстаўнік групы кітайскіх студэнтаў: «На маю думку, БДУ – гэта вельмі моцны ўніверсітэт не толькі ў Беларусі, але і ў свеце. Нашы студэнты сюды прыехалі з вялікай радасцю. Тут пазнаёміліся з выдатнымі выкладчыкамі, таленавітымі студэнтамі, пагутарылі з сябрамі. У нашых студэнтаў вялікая цікавасць да Беларусі. Яны вучацца ў Сумесным інстытуце і хацелі б па-сапраўднаму зразумець, што такое БДУ: яго гісторыя, навука, перспектывы. І вось ім выпаў такі шанец атрымаць гэтыя веды і ўражанні. Хачу выказаць асаблівую падзяку за выдатную арганізацыю і займальную праграму зімовай школы».

Сінь ЧЖОХЭН, студэнт 2 курса Сумеснага інстытута:

«Я ўпершыню ў Беларусі. Зразумеў, што гэта цудоўная краіна з выдатнымі людзьмі. У зімовай школе я даведаўся шмат новага пра краіну і ўніверсітэт, а таксама пазнаёміўся з беларускімі сябрамі. Мяне асабліва ўразілі заняткі па англійскай мове. Выкладчык шмат у чым мне дапамог разабрацца. Акрамя гэтага мне спадабаліся заняткі па ядзернай фізіцы. Вядома, я б хацеў вярнуцца ў Беларусь ізноў».

Бі ВАНЬЮ, студэнтка 2 курса Сумеснага інстытута:

«Я ўпершыню не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Першае, што мяне ўразіла, гэта людзі – такія гасцінныя і добрыя, гатовыя заўсёды прыйсці на дапамогу. Мне спадабаліся заняткі ў зімовай школе, якія я наведвала разам з беларускімі студэнтамі. Для мяне былі карысныя заняткі па фізіцы, па якой я якраз спецыялізуюся. Асабліва мне спадабалася тое, што выкладчыкі натхняюць студэнтаў і заахвочваюць, каб тыя задавалі пытанні».

Сумесная адукацыйная ўстанова функцыянуе ў кітайскім горадзе Далянь. Тут выкладанне 30 % курсаў забяспечваюць выкладчыкі фізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў БДУ. Навучанне ажыццяўляецца ў ДПУ на англійскай мове.

Аляксей ТОЛСЦІК, кіраўнік Сумеснага інстытута з боку БДУ:

«Зімовая школа праходзіць у рамках нашага Сумеснага інстытута, які быў створаны ў 2017 г. Далянскім політэхнічным універсітэтам і БДУ. Цяпер у гэтым інстытуце навучаецца 80 студэнтаў на 1 курсе, 79 – на другім. Па заканчэнні Сумеснага інстытута студэнты атрымаюць два дыпломы – Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Мэта зімовай школы – пашырэнне сферы дзейнасці Сумеснага інстытута, азнаямленне студэнтаў з сучаснымі праблемамі фізікі, матэматыкі, механікі, усталяванне кантактаў кітайскіх студэнтаў са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ. Правядзенне зімовай школы дало магчымасць павысіць прэстыж нашага ўніверсітэта і, адпаведна, прыцягнуць студэнтаў Сумеснага інстытута для паступлення да нас у магістратуру, а далей і ў аспірантуру. Спадзяюся, зімовыя і летнія школы Сумеснага інстытута стануць рэгулярнымі, што будзе спрыяць цеснаму збліжэнню нашых устаноў адукацыі і наладжванню сяброўскіх кантактаў».

Алена ЛЯЎШЭНЯ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

5 лютага 2019 года
Падпісана да друку 4.02.2019 г.
Зак. 40. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by